# Ліхтары ў тумане Тржэбіча

**У мінскай галерэі “Універсітэт культуры” прайшла фотавыстаўка сына Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Чэшскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Іржы Караса. У наведвальнікаў была цудоўная магчымасць пазнаёміцца з Чэхіяй, якую можна адкрыць толькі збочыўшы з накатаных турыстычных маршрутаў. Іржы Карас-малодшы вельмі патрабавальны да сваёй творчасці, таму доўга выбіраў работы для экспазіцыі. Спыніць ваганні дапамагла куратар культурных праектаў пасольства Аксана Аракчэева, якой удзячны аўтар выказаў добрыя словы падчас урачыстага адкрыцця выстаўкі.**



*Іржы Карас-малодшы “Атамкрыж”.*

Фотавыстаўка “Тржэбіч” — гэта магчымасць прагуляцца па горадзе старажытных помнікаў з чалавекам, які тут нарадзіўся. Менавіта таму галоўнымі “героямі” работ Іржы Караса будуць не архітэктурныя “разынкі” сярэднявечча, а нечаканасці, спыненыя аб’ектывам рамантычнага філосафа. Яркія ліхтары над вячэрнім мостам, на якім людскія постаці здаюцца прывідамі. Чарапічныя дахі з вышыні птушынага палёту. Першыя вестуны вясны — травінкі на гарадскіх вуліцах, фонам для якіх служыць архітэктурны помнік далёкай мінуўшчыны. Выкліча ўсмешку пазнавання “трусятня” — шматпавярховы тыповы панэльны дом, які ў нас завуць “хрушчоўкай”. Ажурны крыж на фоне ТЭЦ — таксама гарадская прыкмета.

Помнікі горада: манастырская хрысціянская базіліка XIII стагоддзя, пабудаваная ў раманскім стылі, старажытныя яўрэйскія могілкі, сінагогі, сучасныя дэталі гарадскога пейзажу — аднолькава дарагія фотамастаку, як і ўсё, знаёмае з дзяцінства, што абядноўваецца ў паняцце “родны кут”.

Апрача 24 здымкаў Тржэбіча наведвальнікі галерэі ўбачаць і шэсць здымкаў з цыкла “Майстэрня”. У мінулым годзе Іржы Карас-малодшы пазнаёміўся з Мінскам і наведаў майстэрні славутых беларускіх мастакоў Арлена Кашкурэвіча, Георгія Паплаўскага, Барыса Аракчэева, Леаніда Дударэнкі.

Выстаўка ў галерэі “Універсітэт культуры” — адзін са шматлікіх праектаў культурнага дыялогу паміж Беларуссю і Чэхіяй. Словы павагі і ўдзячнасці спадару Іржы Карасу за тое, што дыялог гэты насычаны і цікавы, выказалі прадстаўнікі Беларускага саюза мастакоў.

**Вольга ПАЎЛЮЧЭНКА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ